Источник: "Звязда" - 2014-07-11

Даты Падзеі Людзі

**1903** год — нарадзіўся выдатны савецкі разведчык-нелегал Рудольф Іванавіч Абель (сапраўднае імя — Вільям Генрыхавіч Фішэр). ФБР і да сённяшняга дня лічыць яго арышт сваім подзвігам, падрабязна распісваючы, як на працягу



4 гадоў скрупулёзна спрабавала яго вылічыць. Але ісціна значна больш простая і больш сумная: Абель быў раскрыты ў выніку здрады. Усе гучныя шпіёнскія справы ў Амерыцы — вынік, як правіла, не дзейнасці контрразведкі, а паказанняў перабежчыкаў і здраднікаў. Абель працаваў у ЗША 10 гадоў, аб створаных ім на амерыканскім кантыненце агентурных сетках дагэтуль існуюць толькі здагадкі. Абель трапіў у Штаты з пашпартам на імя Эндру Каёціса, быў арыштаваны як Эміль Голдфус, назваўся пры арышце палкоўнікам Абелем, узяўшы імя свайго нядаўна памерлага сябра і паплечніка латыша Рудольфа Абеля. З гэтым іменем ён быў асуджаны да 30 гадоў турмы, у 1962 годзе абменены на лётчыка-шпіёна Паўэрса і з ім жа стаў вядомы ўсяму Савецкаму Саюзу пасля выхаду фільма «Мёртвы сезон». Пра тое, што Абель з расійскіх немцаў і насамрэч ён — Фішэр, што нарадзіўся ў Англіі, што працаваў за мяжой яшчэ да вайны (выходзіў на будучага акадэміка Капіцу), што ў Вялікую Айчынную прымаў удзел у радыёгульнях з немцамі — пра ўсё гэта стала вядома толькі нядаўна, а звесткі аб яго нелегальнай дзейнасці да гэтага часу не падлягаюць апублікаванню.

**1925** год — нарадзіўся (г.п. Карэлічы) Андрэй Аляксандравіч Богуш, беларускі вучоны-фізік, член-карэспандэнт НАН Беларусі (1994), доктар фізіка-матэматычных навук (1975), прафесар (1983). Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі (1988) за цыкл работ «Класічная палявая тэорыя элементарных часціц». Аўтар больш за 250 навуковых прац па тэарэтычнай фізіцы і фізіцы высокіх энергій. Распрацаваў эфектыўныя тэарэтыка-групавыя і алгебраічныя метады. Многія важныя фізічныя вынікі ў галіне фізікі элементарных часціц атрыманы ў працэсе ўдзелу ў рэалізацыі міжнародных эксперыментальных праграм па фізіцы высокіх энергій на паскаральніках Дубна, Серпухава і Жэневы.

**1932** год — нарадзіўся (горад Барысаў) Анатоль Аляксандравіч Анікейчык, беларускі скульптар, прафесар (1981), народны мастак Беларусі (1972). Працаваў у галіне манументальнай і станковай скульптуры. Стварыў мемарыялы «Праклён фашызму», «Прарыў», помнікі М. Гастэлу і яго экіпажу, А. Матросову. Сярод іншых работ: фантаны «Юнацтва» каля касцёла на пл. Незалежнасці і «Купалінкі» ў парку імя Я. Купалы; партрэты Л. Бетховена, П. Машэрава, Г. Ахматавай і іншых. Лаўрэат прэміі Ленінскага камсамола Беларусі (1967) і Дзяржаўнай прэміі Беларусі (1974). Памёр у 1989 годзе.

## Было сказана

**Кузьма ЧОРНЫ, пісьменнік, публіцыст:**

***«Усё на свеце бяжыць і не варочаецца. Не трать дарэмна і мінуты жыцця, бо не вернеш яго».***